УДК 94(41/99)

# РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ПАДЗЕІ 1905–1907 гг. І БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ Ў ПАЧАТКУ ХХ ст.

***Ю.І. Літвіноўская***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, вул. П. Броўкі, 6, 220013, г. Мінск, Беларусь, litwinowski@yandex.by*

У артыкуле разглядаюцца асобныя напрамкі беларускага нацыянальнага руху ў пачатку ХХ стагоддзя. Яны былі звязаны з рэвалюцыйнымі падзеямі ў Расіі ў 1905–1907 гг., асаблівасцямі той абстаноўкі, у якой адбываўся працэс станаўлення нацыянальнай ідэі на Беларусі. Яна вызначалася спецыфікай эканамічнага, палітычнага і культурнага развіцця беларускіх зямель у ХІХ стагоддзі, якая садзейнічала фарміраванню ў асяроддзі дэмакратычнай інтэлігенцыі адносна невялікай групы, якая ясна ўяўляла, што Беларусь мае ўсе ўмовы для самастойнага развіцця.

***Ключавыя словы:*** *БСГ; рэвалюцыя; беларуская нацыянальная ідэя; штотыднёвая газета; заходнерусізм.*

# РЕВОЛЮЦИОННЫЕ СОБЫТИЯ 1905–1907 гг. И БЕЛОРУССКАЯ НАЦИОНАЛЬНАЯ ИДЕЯ В НАЧАЛЕ ХХ в.

***Ю.И. Литвиновская***

*Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники, ул. П. Бровки, 6, 220013, г. Минск, Беларусь, litwinowski@yandex.by*

В статье рассматриваются отдельные направления белорусского национального движения в начале ХХ века. Они были связаны с революционными событиями в России в 1905–1907 гг., особенностями той обстановки в которой происходил процесс становления национальной идеи в Беларуси. Она определялась спецификой экономического, политического и культурного развития белорусских земель в ХІХ веке, которая содействовала формированию в среде демократической интеллигенции относительно небольшой группы которая ясно представляла, что Беларусь имеет все условия для самостоятельного развития.

***Ключевые слова:*** *БСГ; революция; белорусская национальная идея; еженедельная газета; западнорусизм.*

# THE REVOLUTIONARY EVENTS OF 1905–1907 AND THE BELARUSIAN NATIONAL IDEA AT THE BEGINNING OF THE XX CENTURY

***Y. Litvinouskaya***

*Belarusian state University of Informatics and Radioelectronics, P. Brouki St., 6, 220013, Minsk, Belarus, litwinowski@yandex.by*

The article examines certain trends of the Belarusian national movement at the beginning of the XX century. They were associated with revolutionary events in Russia in 1905–1907, peculiarities of the situation in which the process of formation of the national idea in Belarus took place. It was determined by the specifics of the economic, political and cultural development of the Belarusian lands in the XIX century, which contributed to the formation of a relatively small group among the democratic intelligentsia, which clearly understood that Belarus had all the conditions for independent development.

***Keywords:*** *BSC; revolution; Belarusian national idea; weekly newspaper; zapadnorusizm.*

Пасля вайны з Напалеонам, на працягу ўсяго перыяду XIX ст., грамадска-палітычны рух на Беларусі развіваўся пад уплывам рэвалюцыйных падзей у Заходняй Еўропе, расійскай рэвалюцыйнай думкі і польскіх нацыянальна-вызваленчых ідэй.

У выніку канец XIX – пачатак XX ст. пераўтварыўся на час, калі пачалося нацыянальнае адраджэнне беларускага народа. Рост нацыянальнай самасвядомасці беларусаў прывёў да фарміравання беларускіх нацыянальных палітычных арганізацый, буйнейшай з якіх стала Беларуская рэвалюцыйная грамада.

Зімой 1902–1903 гг. нацыянальна-культурныя гурткі беларускай моладзі Мінска, Вільні і Пецярбурга аб'ядноўваюцца ў адзіную арганізацыю Беларускую рэвалюцыйную грамаду (БРГ), якая пазней стала называцца Беларускай сацыялістычнай грамадой (БСГ). Яе стваральнікамі былі Іван і Антон Луцкевічы, Вацлаў Іваноўскі, Казімір Кастравіцкі, Алаіза Пашкевіч (Цётка), Алесь Бурбіс і інш.

У канцы снежня 1903 г. у Вільні адбыўся першы з'езд БРГ. На ім Грамада была перайменавана з рэвалюцыйнай у сацыялістычную і прынята яе першая праграма. Па нацыянальным пытанні Грамада выступала за тое, "каб усе народы мелі як найбольшую свабоду", а найбольш пажаданай формай забеспячэння нацыянальнай свабоды ў

эпоху капіталізму лічылася незалежная дэмакратычная рэспубліка [1, с. 311].

Рэвалюцыйныя падзеі ў Расіі садзейнічалі ўздыму беларускага нацыянальнага руху на якасна новую ступень. 9 студзеня 1905 г. царскія ўлады расстралялі мірную дэманстрацыю рабочых Пецярбурга. У самадзяржаўнай імперыі пачалася першая ў яе гісторыі буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя. Стагоддзямі фарміраваўшыяся прынцыпы і асновы існаваўшага ў краіне грамадства былі ўзрушаныя дашчэнту.

«Крывавая нядзеля» ў Пецярбурзе выклікала масавы рух салідарнасці па ўсей краіне. Бура абурэння ахапіла Цэнтральна-прамысловы раён, Украіну, Прыбалтыку, Паволжа, Урал, Закаўказзе. Забастоўкі салідарнасці адбыліся ў 30 гарадах і мястэчках Беларусі – Мінску, Гомелі, Магілёве, Гродне, Брэсце, Слоніме, Смаргоні і інш. У іх брала ўдзел каля 34 тыс. чалавек [2, с. 383].

Вясной 1905 г. па Беларусі пракацілася хваля першамайскіх маніфестацый. У 35 гарадах і мястэчках мела месца каля 170 стачак [3, с. 189]. Выступленні рабочых былі падтрыманы хваляваннямі ў вёсцы. У красавіку–чэрвені 1905 г. адбылося 237 сялянскіх хваляванняў. Сяляне вылучалі як эканамічныя, так і палітычныя патрабаванні [4, прилож. 3]. Колькасць удзельнікаў палітычных стачак дасягала 100 тысяч [5, с. 216].

Пад націскам першай расійскай рэвалюцыі самадзяржаўе вымушана было адступіць. 17 кастрычніка 1905 г. цар выдаў маніфест у якім заяўлялася аб увядзенні ў Расіі, упершыню за час яе існавання, палітычных свабод і скліканні Дзяржаўнай думы – заканадаўчага органа краіны.

Можна сказаць, што адкрывалася новая старонка ў гісторыі Расіі. Паўстала адносная раўнавага палітычных сіл. Пачаўся працэс станаўлення і структуравання масавых арганізацый розных слаёў насельніцтва. Але найважнейшай асаблівасцю быў пачатак легальнага працэсу партыйнага будаўніцтва.

Спецыфіка абстаноўкі якая склалася ў Расіі восенню 1905 г. адбілася і на сітуацыі ў беларускім нацыянальным руху. У пачатку студзеня 1906 г. у Мінску адбыўся другі з’езд БСГ. З’езд прыняў новую праграму партыі. У адрозненні ад першай праграмы, другая абвяшчала Грамаду арганізацыяй не нацыянальна беларускай, а інтэрнацыянальнай краёвай партыяй. З’езд выказаўся за стварэнне ў

Расіі федэратыўнай дэмакратычнай рэспублікі са свабодным самавызначэннем і культурна-нацыянальнай аўтаноміяй народнасцей. Для Беларусі Грамада патрабавала дзяржаўнай аўтаноміі з мясцовым соймам у Вільні [7, с. 157–163].

Магчымасць мець легальныя перыядычныя выданні спрыяла ажыўленню нацыянальнага руху, надала яму новы імпульс. Умацавалася сувязь паміж палітычнымі і асветніцкімі арганізацыямі. Гэтаму шмат у чым садзейнічала і штотыднёвая газета “Наша доля”, якая стала выдавацца з 1 верасня 1906 г. І хоць час яе выдання быў непрацяглым, усяго 3 месяцы (было выдадзена шэсць нумароў, чатыры з якіх за антыўрадавую накіраванасць былі канфіскаваны), яна адыграла важную кансалідуючую ролю ў беларускім руху.

Наступленне рэакцыі значна звузіла магчымасці нацыянальна-дэмакратычнага руху. Прадбачачы закрыццё газеты, выдаўцы заснавалі іншы штотыднёвік − “Наша ніва”, які працягваў тэндэнцыі закладзеныя “Нашай доляй”. Ён выходзіў да 1915 г. Выдаўцы газеты на чале з братамі Луцкевічамі, каб пазбегнуць закрыцця, узялі больш памяркоўны курс. Не з’яўляючыся афіцыйным органам БСГ, газета стала асяродкам беларускага культурнага жыцця. У гэты перыяд яна выступала за дэмакратызацыю грамадства, нацыянальна-культурнае адраджэнне беларускага народа, пашырэнне дзейнасці земстваў, рэформу судоў, хутарызацыю сельскай гаспадаркі і г.д. “Наша ніва” надрукавала сотні карэспандэнцый. Для сялян яна пачала выдаваць “Беларускі календар”, потым часопіс “Саха”. У 1912 г. выходзіць літаратурны і грамадска-палітычны альманах “Маладая Беларусь”. Былі створаны выдавецтвы “Загляне сонца і ў наша ваконца”, “Наша хата”, “Беларус” і інш. Газета адольвала і грашовыя цяжкасці, і царскую цэнзуру і друкавалася да жніўня 1915 г., да нямецкай акупацыі Вільні.

“Наша ніва” згуртавала вакол сябе плеяду маладых аўтараў, якія стварылі класіку беларускай літаратуры XX ст. Сярод найвыдатнейшых былі Янка Купала, Якуб Колас, Цётка, Максім Багдановіч, Змітрок Бядуля, Максім Гарэцкі, Вацлаў Ластоўскі і інш.

Газета існавала ў вельмі складаных умовах. Яе ўсяляк цкавалі і ганьбілі з аднаго боку расійскія афіцыйныя і чарнасоценна-акцябрысцкія, а з іншага польскія панска-клерыкальныя выданні. Расійская рэакцыйная прэса адкрыта патрабавала закрыцця беларускай газеты [8, с. 1]. Яна аб’яўляла беларускіх “сепаратыстаў” больш

небяспечнымі ворагамі “единой и неделимой России”, чым рэвалюцыйныя партыі з іх сацыялістычнымі марамі.

Характэрнай асаблівасцю беларускага нацыянальнага руху ў пачатку ХХ ст. з’яўлялася тое, што ў ім удзельнічалі пераважна нешматлікія прадстаўнікі студэнцкай і вучнёўскай моладзі. Падчас першай расійскай рэвалюцыі і пазней гэты рух падтрымалі сяляне і рабочыя. Аднак верхнія пласты насельніцтва краю – дваранства і буржуазія ў сваёй пераважнай большасці не прызнавалі існавання самастойнага беларускага этнасу і адмоўна ставіліся да беларускага нацыянальнага руху. Гэта сведчыць аб тым, што ў Беларусі на пачатку ХХ ст. усе яшчэ адсутнічала этнічная эліта. Уздым нацыянальнай адраджэнскай хвалі ў перыяд першай расійскай рэвалюцыі закрануў толькі асобных прадстаўнікоў мясцовай эліты, якія аказвалі фінансавую падтрымку нацыянальнаму руху. Але такіх былі адзінкі. Наогул беларускі нацыянальны рух з’яўляўся народніцкім. Ён не быў шырокім, але аб’ядноўваў лепшых прадстаўнікоў беларускай інтэлігенцыі.

Пасля паражэння першай расійскай рэвалюцыі і дзяржаўнага перавароту 3 чэрвеня 1907 г. БСГ згарнула свае падпольныя структуры і як партыя часова перастала існаваць. Яе кіраўнікі сканцэнтравалі сваю ўвагу на развіцці легальнага нацыянальна-культурнага руху, цэнтрам якога на працягу дзесяці гадоў была газета “Наша ніва”.

Дзейнасць газеты адыграла важную ролю ў справе кансалідацыі беларускай нацыі, фарміравання самасвядомасці беларусаў, развіцця іх мовы і культуры, а БСГ як партыя аднавіла сваю дзейнасць толькі пасля Лютаўскай рэвалюцыі [2, с. 423, 437; 9, с. 177–181].

У гэты ж час на Беларусі пашыраецца прапаганда вялікадзяржаўнага шавінізму. Праваслаўнае беларускае насельніцтва аб’яўляецца рускім. У кастрычніку 1906 г. на з’ездзе ў Вільні акцябрысты і чарнасоценцы заходніх губерняў аб’ядналіся ў “Русский окраинный союз” (РОС). Яго дзейнасць вялась пад лозунгам “Расія для рускіх і рускія павінны кіраваць ею” [2, с. 398].

Працэсы нацыянальнага адраджэння, якія, хоць і павольна, але прабівалі сабе дарогу на Беларусі не адпавядалі ўрадавай палітыцы, абгрунтаваннем якой была тэорыя “заходнерусізму”.

Тэорыя “заходнерусізму” пачала складвацца ў першай палове XIX ст. У яе аснове ляжалі спробы даказаць, што беларусы і рускія гэта адзін народ, беларуская мова з’яўляецца дыялектам рускай мовы,

тэорыя адмаўляла беларусам у праве мець сваю гісторыю і культуру. Яе галоўнае прызначэнне даказаць правы Расійскай імперыі на валоданне беларускімі землямі і спрыяць русіфікацыі краю. “Заходнерусізм” абапіраўся на афіцыйную дактрыну сфармуляваную ў 1830-я гады міністрам асветы С. Уваравым у трыядзе “праваслаўе, самадзяржаўе, народнасць”.

Заходнерусізм, разглядаючы беларускі народ як адну з частак рускага народу, што адрозніваецца толькі этнаграфічнымі асаблівасцямі, а тэрыторыю Беларусі – як частку адзінай вялікай Русі, адмаўляў правы беларускага народа на самастойнае развіццё. Вызначаючы сутнасць заходнерусізму, адзін з яго ідэолагаў пісаў: “Расійскі народ складаецца з трох пляменьняў: вялікарусаў, маларосаў і беларусаў. Гэта факт расійскага жыцця; даўно ен існуе, і, безумоўна, будзе існаваць далей, пакуль у Расіі будзе просты народ … Усе мы, расійскія інтэлігенцкія людзі, навучаліся размаўляць і размаўляем адной і той самай літаратурнай расійскай мовай … Бязглузда было б нам дзяліцца на племянныя групы. А тым больш праводзіць гэты падзел у народ”. Сутнасным элементам гэтай канцэпцыі з’яўлялася таксама ўпэўненасць у тым, што палітычная незалежнасць Беларусі – гэта шкодная ўтопія [1, с. 48].

Рэвалюцыйныя падзеі ў Расіі паскорылі афармленне партый і арганізацый рознага накірунку. Праз некалькі гадоў адбылося і арганізацыйнае афармленне “западноруссов”. У 1911 г. у Пецярбурзе ўзнікла “Заходне-Рускае таварыства”. У яго склад увайшлі буйныя землеўладальнікі, праваслаўнае духавенства, чыноўнікі. Члены таварыства арганізоўвалі лекцыі, навуковыя канферэнцыі, праводзілі палітычныя сходы [3, с. 348].

На мяжы XIX–XX стст. беларуская нацыянальная ідэя знаходзілася ў сур’ёзным процістаянні, канкурэнтнай барацьбе не толькі з канцэпцыяй заходнерусізму, але і з краёвасцю.

У канцы 1912 г. у выданнях “Kurier Krajowy” і “Вечерняя газета”, якія знаходзіліся пад кантролем групы беларускіх палітыкаў у Вільні (браты А. і І. Луцкевічы, В. Ластоўскі і інш.) была сфармулявана ідэя палітычнай нацыі, з’яўленне якой звязана таксама з феноменам так званай краёвасці.

Асноўным пастулатам краёвай ідэалогіі было сцвярджэнне, што ўсе карэнныя народы Беларуска-Літоўскага краю ўтвараюць адзіную

нацыю, да якой належыць кожны, хто адчувае сябе грамадзянінам краю, незалежна ад сацыяльнага паходжання і культурнай арыентацыі.

Першымі з прапагандай краёвых поглядаў выступіў шэраг вядомых дзеячаў беларускага нацыянальнага руху такіх як Р. Скірмунт, К. Скірмунт, М. Ромэр і інш. А. і І. Луцкевічы і В. Ластоўскі не толькі прынялі гэту ідэю, але і актыўна яе прапагандавалі. А. Луцкевіч спадзяваўся, што папулярызацыя ідэі палітычнай нацыі на польскай і рускай мовах паспрыяе далучэнню да беларускага руху як русіфікаваных, так і паланізаваных беларусаў. Краёвасць як палітычны прынцып на практыцы аб'ектыўна ставіў на парадак дня рэалізацыю ідэі дзяржаўнасці гістарычнай Літвы.

Масавы характар беларускі нацыянальны рух набывае падчас Першай сусветнай вайны.

Характарызуючы беларускі нацыянальны рух у гэты перыяд нельга не адзначыць, што яго размах і ўплыў былі яшчэ недастатковыя для таго, каб ён мог выканаць патэнцыяльна ўласцівую яму ролю кансалідуючай сілы грамадства, якое гуртавалася б у межах уласнай дзяржаўнасці на прынцыпах нацыянальнай згоды. Лакальныя нацыянальна-дзяржаўніцкія памкненні Беларусі з яе размытай этнакультурнай ідэнтычнасцю і глыбокай інтэграванасцю ў агульнаімперскі арганізм пакуль што патанулі ў грандыёзным супрацьстаянні сацыяльна-палітычных сіл і інтарэсаў у маштабах усей ахопленай татальным крызісам Расійскай дзяржавы. У ходзе расійскіх рэвалюцый 1917 г. не ўдалося дасягнуць такога вырашэння беларускай праблемы, якое ў найбольшай ступені адпавядала б інтарэсам насельніцтва краю [1, с. 48].

Але нягледзячы на неспрыяльныя ўмовы ў цэлым, XIX стагоддзе і пачатак XX стагоддзя – найбольш важны этап у кансалідацыі беларускага этнасу ў нацыю і росту яго нацыянальнай самасвядомасці. Працяг гэтых працэсаў адбываўся ў наступныя дзесяцігоддзі XX стагоддзя.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Минск, 2005. Т. 4.
2. Нарысы гісторыі Беларусі: у 2 частках. Мінск: Беларусь, 1994. Ч. 1.
3. Гісторыя Беларусі: у 2 ч. Ч. 2. XIX–XX стагоддзі. Мінск, 2002.
4. Шабуня, К.И. Аграрный вопрос и крестьянское движение в Белоруссии в революции1905–1907 гг. Минск, 1962.

5. История рабочего класса БССР. Минск, 1984. Т. 1.
6. Біч, М. У змаганні за лепшую долю // Полымя. 1966. № 8. С. 132–138.
7. Шлюбскі, А. Да гісторыі БСГ // Полымя. 1925. № 5. С. 157–163.
8. Минское слово. 1907. № 160.
9. Бурбіс, А. Беларуская сацыялістычная грамада ў першым перыядзе яе працы (1903–1907) // Беларусь. Зборнік. Менск:, 1924. С. 177–181.

**УДК 94 (476) «1861/1862»**

# ПРЫКЛАДЫ ВЫКАРЫСТАННЯ ПОЛЬСКАМОЎНЫХ АДОЗВАЎ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСКІХ ГУБЕРНЯЎ У 1861–1862 гг.

***Д.У. Лішай***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь,* *lishaiy-d96@yandex.ru*

Разглядаюцца асаблівасці выкарыстання польскамоўных антыўрадавых адозваў на тэрыторыі беларускіх губерняў у 1861–1862 гг. Зыходзячы са зместу агітацыйных матэрыялаў, акцэнтуецца ўвага на наяўнасці ідэй сумеснага ўзброенага выступлення насельніцтва Царства Польскага і зямель былога Вялікага Княства Літоўскага супраць расійскіх улад. Падкрэсліваецца заангажаванасць вучняў мясцовых гімназій у пратэсны рух. Прасочваюцца агульныя матывы ў закліках да барацьбы як у перыяд актывізацыі паўстанцкага руху ў 60-я гг. XIX ст., так і падчас польска-савецкай вайны 1919–1921 гг.

***Ключавыя словы:*** *польскамоўныя адозвы; антыўрадавая агітацыя, вучні гімназій; паўстанне, губерня.*

# ПРИМЕРЫ ИСПОЛЬЗОВАНИЯ ПОЛЬСКОЯЗЫЧНЫХ ВОЗЗВАНИЙ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛОРУССКИХ ГУБЕРНИЙ В 1861–1862 гг.

***Д.В. Лишай***

*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь,* *lishaiy-d96@yandex.ru*

Рассматриваются особенности использования польскоязычных антиправительственных воззваний на территории белорусских губерний в 1861–1862 гг. Исходя из содержания агитационных материалов, акцентируется внимание на наличии идей совместного вооруженного